# Творчая імпрэза Віктара Кунцэвіча прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы

---

- 21.11.2024 19:24
- Культура

**У выставачным комплексе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі 21 лістапада 2024 года на сімвалічны літаратурны Алімп узышоў пісьменнік з Магілёўскага абласнога аддзялення СПБ Віктар Кунцэвіч.**




Адбылася чарговая творчая імпрэза ў рамках праекта, арганізаванага Саюзам пісьменнікаў Беларусі і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Творцы, уганараваныя высокімі ўзнагародамі, трымаюць своеасаблівую справаздачу перад чытачамі. Гэта лаўрэаты Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, заслужаныя дзеячы культуры Рэспублікі Беларусь. Гэта нашы сучаснікі, якія робяць свой адметны ўнёсак у літаратурную спадчыну краіны.

Віктар Кунцэвіч, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі сёлетняга года, даўно вызначыўся ў сваім прызначэнні:

*Мы ўсе паэты ў свеце гэтым,*

*Калі сябе лічыць сусветам.*

*Калі глядзець на белы свет*

*Праз свой маленечкі сусвет*

*І пакідаць ад думак след.*










Безумоўна, прыемна кожнаму адчуваць сябе творчай асобай. Але ў паэта ўсё ж такі асаблівы дар бачыць, адчуваць, адлюстроўваць праз мастацкае слова жыццё ва ўсіх яго праявах.

Віктар Іванавіч — аўтар кніг паэзіі «Зваротныя масты», «Горкая спакуса», «Адзінотны дождж», «Гул у звоне». Разам з тым, яго літаратурны поспех замацавала кніга прозы «Калі

чужая душа — твая». Нярэдка здараецца, што чалавек трапляе ў складаную сітуацыю. Як знайсці з яе выхад? Героі Віктара Кунцэвіча завуць чытача разам перажываць цяжкасці, дапамагаюць загартоўваць характар.

Пра ўсё гэта і многае іншае Віктар Іванавіч распавёў прыхільнікам сваёй творчасці падчас сустрэчы ў Нацыянальнай бібліятэцы.




Тым больш было прыемна, што да літаратурнага Алімпу Беларусі далучыўся сапраўдны літаратурны дэсант з Бялыніч, дзе жыве пісьменнік, і якога вельмі шануюць землякі. Дырэктар Бялыніцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі Аксана Шагавік і яе калегі падрыхтавалі захапляльную кампазіцыю па творах Віктара Кунцэвіча.

Трымалі слова намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аляксандр Бабук, намеснік старшыні СПБ, галоўны рэдактар газеты «ЛІМ» Аляксей Чарота.




З вялікім задавальненнем прыйшоў на сустрэчу і Навум Гальпяровіч, пісьменнік, аўтар тэлевізійнага праекта «Суразмоўцы», удзел у якім Віктар Кунцэвіч браў літаральна нядаўна. Навум Якаўлевіч заўважыў, што з Віктарам Кунцэвічам цікава весці гаворку і на тэлевізійным экране, і пры асабістай сустрэчы. Ён шчыры, адкрыты, душэўны чалавек.





**Марыя ЛІПЕНЬ**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА**